# Танцуйма разам!

***18 красавіка ў сярэдняй школе № 168 г. Мінска адбыўся Другі раённы конкурс беларускага народнага танца «Ветразь»; на якім спаборнічалі танцавальныя пары розных узроставых катэгорыяў: з 3 па 5 класы, з 6 па 8 класы, з 9 па 11 класы, ад 18 да 32 гадоў. Конкурс ладзіўся ў межах IX Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня». Мэта фэсту – захаванне і адраджэнне нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі, прыцягненне дзяцей і моладзі да нацыянальных культурных традыцыяў. Упершыню фестываль быў праведзены ў 1998 – 1999 гадах у межах Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці. У 2001 годзе фэст ахапіў усю Гомельшчыну, а фестывалі 2004, 2006 і 2008 гадоў мелі статус рэспубліканскіх.***

Першы раённы конкурс беларускага народнага танца «Ветразь» прайшоў 22 красавіка мінулага года ў Цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ветразь». Аўтарам і кіраўніком другога конкурсу стаў этнахарэограф Мікола Козенка, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва. У конкурсе ўзялі ўдзел фальклорны калектыў «Мілавіца», узорны ансамбль танца «Рамонак», фальклорны гурт «Берагіня», узорны харэаграфічны ансамбль «Першацвет», дзіцячы фальклорны калектыў «Вясейка», калектывы мінскіх сярэдніх школаў і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, танцавальная студыя фальклорнага гурта «Guda» і іншыя.

Выступленне танцавальных параў ацэньвалася ў адкрытай і закрытай васьмібальнай сістэме па наступных крытэрыях: веданне кампазіцыі танца, захаванне мясцовага танцавальнага стылю, музычнае выкананне, веданне народнага нацыянальнага этыкету, наяўнасць касцюмаў, якія адпавядаюць мясцовай традыцыі.





Намеснік старшыні Рэспубліканскага грамадскага савета па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь Анатоль Бутэвіч зазначыў пры адкрыцці конкурсу:

– Прыемна бачыць столькі зацікаўленых удзельнікаў гэтага незвычайнага свята, таму я перакананы: нашай культуры наканаваная вялікая будучыня. Мне ўяўляецца, што нашае нацыянальнае дрэва вельмі магутнае, яно мае свае карані – гэта нашая гісторыя, традыцыі, тое, што заклалі нашыя бацькі. А крона дрэва – гэта вы, моладзь, нашае будучае пакаленне, якое будзе захоўваць, зберагаць гэтыя традыцыі. Вельмі важна, каб вы памяталі родную мову, народныя танцы і спевы, бо гэта нашая аснова. Хочацца, каб у вашых ветразяў быў заўсёды спадарожны вецер, які выведзе вас на шчаслівую дарогу жыцця.

Танцоры вельмі ўдала, прыгожа, з вялікім натхненнем прадстаўлялі журы і гледачам танцы, якія ва ўсіх атрымліваліся па-рознаму. У малодшых выканаўцаў «Полька», «Мікіта», «Лявоніха», «Какетка» былі крыху наіўнымі, з натуральным імпэтам, у старэйшых атрымліваліся з большай дасканаласцю і ўпэўненасцю. Акрамя ўсім вядомых танцаў былі прадстаўленыя на конкурсе і танцы з нязвыклымі для нас назвамі: «Картузэ», «Мальвіна», «Матылёк», але іх удзельнікі выканалі не горш за іншыя. Конкурс завяршыўся ўзнагароджваннем удзельнікаў дыпломамі аргкамітэта і спецыяльнымі дыпломамі.

Напрыканцы ўдзельнікі конкурсу падзяліліся сваімі ўражаннямі і эмоцыямі. Вось што распавяла 24-гадовая мінчанка Кацярына Шэйка, ураджэнка г.п. Акцябрскі, якая стала дыпламанткай сёлетняга конкурсу:

– Я з 2012 года ўваходжу ў танцавальную студыю фальклорнага гурта «Guda». Тое, чым я займаюся, мне цалкам падабаецца. Танец – гэта стыль майго жыцця. Калі дрэнны настрой, трэба проста пусціцца ў скокі, і адразу ўсё стане на свае месцы. Я была не раз на фестывалях фальклорнага мастацтва, але як удзельніца конкурсу танцавальных параў – упершыню. Шмат атрымала эмоцыяў, але хацелася б, каб народныя песні і танцы не былі ў рамках конкурсу, бо ў кожнага рэгіёна свая манера выканання, свой стыль. Як можна гэта параўноўваць і ацэньв..ць?

***Некалі спявак Джэймс Браўн сказаў: «Любую праблему можна вырашыць, калі танчыш». Таму танцуйце, калі вам добра, танцуйце, калі сумна, бо гэта сапраўдны адпачынак для душы! А магчымасць патанчыць разам, у талацэ, будзе ва ўсіх ахвочых на IX фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня», які пройдзе 23 – 26 чэрвеня у г.п. Акцябрскі.***

*Дар'я ШЛАПАКОВА,*
*студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ*